*Аліна Зайко*

# АСОБНЫЯ СЕМАНТЫЧНЫЯ АСПЕКТЫ ВОБРАЗА *ЧАРАПАХІ* Ў КАНТЭКСЦЕ СЛАВЯНСКАГА ФАЛЬКЛОРУ

| Навуковая класіфікацыя | |
|---|---|
| Царства: | Жывёлы |
| Тып: | Хордавыя |
| Падтып: | Хрыбетныя |
| Клас: | Паўзуны |
| Атрад: | Чарапахі |
| Род: | Балотныя чарапахі |

Яшчэ з каменнага веку разам з прагрэсам у матэрыяльнай культуры славян развівалася і ўдасканальвалася і яго духоўная культура, міфалагічна-рэлігійныя ўяўленні, дэкаратыўна- прыкладное і музычнае мастацтва, зачаткі навуковых ведаў пра акаляючы свет. Практычна ўся прырода - жывёльны свет, расліннасць, важнейшыя прыродныя аб'екты і стыхіі - знаходзілі сваё адлюстраванне ў міфах і абрадах.

Адным з самых распаўсюджаных у свеце культаў з'яўляецца культ жывёл. Сцвярджэннем яго бытавання на Беларусі з'яўляюцца археаланічныя знаходкі. Пра гэта найперш сведчыць амулеты з прасвідраваных зубоў - дзіка, мядзведзя, ваўка, лася, бабра, а таксама скульптурныя выявы звяроў, птушак і змей, пахаванні жывёл у курганах [6].

Культ жывёл бясспрэчна звязаны з шэрагам вераванняў, такіх як анімізм, татэмізм, фетышызм і інш. Усе яны далі свой адбітак на ўспрыманне чалавекам жывёл, на наданне ім месца ў прасторы. Гэтыя ўяўленні магчыма прасачыць і выявіць у археалагічных знаходках і ў фальклоры.

Сярод насельнікаў беларускай зямлі, якія не асэнсаваны ці слаба асэнсаваны ў семіятычным кантэксце пэўнае месца займаюць жывёлы, што рэдка сустракаюцца або знаходзяцца пад пагрозай знікнення (занесеныя ў Чырвоную кнігу Беларусі). Да такіх прадстаўнікоў нашай фауны адносіцца і балотная чарапаха. Абазначым некаторыя рысы яе семантыкі ў беларускай традыцыйнай культуры і ў культуры іншых славян.

Найперш трэба заўважыць, што від балотнай еўрапейскай чарапахі (Emys orbicularis) - адзіны прадстаўнік з гэтага атраду паўзуноў у Беларусі[29]. Ён сустракаецца толькі на поўдні: верагодная сучасная паўночная мяжа яе лакалізацыі праходзіць на поўдзень ад лініі Гродна-Стаўбцы-Чэрыкаў. Ёсць падставы меркаваць, што гэта лінія адышла на поўдзень за апошнія 3-4 дзесяцігодцзі. Раней даволі вялікая колькасць чарапах назіралася ў вярхоўях ракі Прыпяць [7, с. 17]. Такім чынам, нязначы па тэрыторыі арэал рассялення чарапах, цесна лакалізуе бытаванне вераванняў пра яе толькі ў пэўных гісторыка-этнаграфічных рэгіёнах (часцей гэта Заходняе і Усходняе Палессе, часткова поўдзень Панямоння).

Этымалогія назвы *чарапаха (жаула, жаулака, жаўлба, жаўлбка)* паходзіць ад слова «чэрап», якое змяніла больш стражытнае «*желвак*» (што значыць выпуклае зацвярдзенне на целе чалавека ці жывёлы) [9, с. 98].

Як і ў большасці міфаў аб паходжанні жывёл, з'яўленне чарапахі ў міфалагічных сюжэтах мае пераважна перверсійную форму [2, с. 548]. Так па традыцыйных вераваннях палешукоў гэта ведзьма, якая мыла бялізну ў святочны дзень, і якая ўгледзеўшы людзей, легла на лаўку і накрылася ночвамі. За гэта яна была пакарана і зраслася з лаўкай і ночвамі. Менавіта з гэтай легендай перасякаецца і другая, па якой ведзьма можа ператварацца ў чарапаху і ў такім выглядзе ў Велікодную ноч можа пралазіць у хлеў і забіраць малако ў чужых кароў [1, с. 392-393].

Падобныя легенды пра паходжанне чарапахі існуюць і ў іншых славян. У балгар чарапха пайшла ад нявесткі, якая не падрыхтавала свёкру хлеба да абеду і з сораму села на хлебную дошку і накрылася дзяжой або дачка, якая не ў час падрыхтавала цеста зраслася з хлебнай дошкай і цестам у выніку матчынага праклёну.

Акрамя таго ў беларусаў-палешукоў і ўкраінцаў былі распаўсюджаннымі ўяўленні аб тым, што чарапаха паходзіць ад змяі (гадзюкі). Так у легендах палешукоў гэта змяя, якак атрымала панцыр у знак боскага пакарання, пасля таго як залазіла на людзей і выядала ім нос і вочы [1, с. 393].

[24] Вельмі рэдкі від на тэрыторыі Беларусі. Балотная чарапаха ўключана ў Чырвоны спіс МСАП (LR/nt, версия 2.3, 1994), занесена ў Чырвоную кнігу Беларусі (III катэгорыя аховы), Чырвоныя кнігі Літвы і Латвіі *(каментар А.Зайко).*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




*Малюнак 1* - Балотная чарапаха, выява чарапахі на памятнай манеце Нацбанка Беларусі

Калі разглядаць тыпалагічны аспект чарапахі ў беларускай міфалогіі, то неабходна адзначыць, што яна адносіцца да шэрагу выразна адмоўных жывых істот, такіх як *гадзюка, шэршань. мошкі, камары* і інш. Як змяю і іншых гадаў, чарапаху лічылі атрутнай, а яе укус смяротным [1, с. 393]. У палешукоў існавала павер'е, што калі ўзяць чарапаху ў рукі і яна абмочыць, то ад гэтага можна памерці [2, с. 548]. Акрамя таго, напрыклад, палякі верылі, што пухліны на шыі ў чалавека выклікае чарапаха, якая пралезла ў нутро і вывела там патомства [1, с. 394]. Чарапаху аб'ядноўвае з іншымі гадамі і яе сувязь з громам, дажджом и градам. Каб не баяцца грома, у Сербіі ядуць яйца чарапахі. Забойства чарапахі выклікае град, а ее пераварачванне — дождж, таму у Балгарыі у час засухі яе пераварочваюць наўмысна [1, с. 393]. Найбольш верагодна, што дзіцячая забаўлянка на Тураўшчыне, калі дзеці, абмахваючыся галінкамі з лістамі, якая называлася «чаш», прыгаворвалі: «*Чаш - чэрэпаш»,* даўней мела магічны аспект выклікання дажджу [2, с. 548].

Месцы бытавання чарапахі: неглыбокія спакойныя вадаёмы, забалочаныя старыцы рэк, ціхія рачныя затокі або вадаёмы побач з людымі месцамі, паўплывалі на дачыненне гэтай жывёлы да прадстаўнікоў хтанічнага свету. Такое меркаванне звязана з міфалагічным светаўспрыманнем: дзе пагранічча зямлі і вады было пераходам у «той свет». Стаўленне да чарапахі як да прадстаўніка хтанічнага свету абумовіла наданне ёй чарадзейных рысаў. Так на Палессі (таксама ў украінцаў, сербаў, далматцаў) бытавала павер'е, што калі знайсці гняздо чарапахі, то патрэбна абгарадзіць яго калкамі так, каб яна не магла прабрацца да сваіх яек. Чарапаха, убачыўшы свае гняздо абгароджаным і не маючы магчымасці да яго прабрацца, ідзе шукаць Разрыў-траву. Калі прынясе то яна кідае яе на калы. У гэты час калкі самі сабою выпадаюць з зямлі і гняздо робіцца свабодным. Кінутую траву трэба падабраць, узяць з яе адно каліва і, разрэзаўшы палец, пакласці яе ў гэты разрэз і перавязаць. Калі палец загоіцца, ад аднаго толькі дакранання ім да замка, то любы засоў разваліцца [1, с. 394].

Неабходна зазначыць, што ў семантыцы чарапахі вылучаюцца рысы, па якіх яна станоўча ўплывае на некаторыя галіны жывёлагадоўлі. Так, напрыклад, у вёсцы Хатомель Столінскага р-на лічылася, што закапаная каля ўваходу ў хлеў чарапаха, памагае развядзенню свіней [2, с. 548]. Гэта збліжае яе з вобразамі *хатняга вужа, тхара* або *крата*, якія таксама аказваюць станоўчы ўплыў на гэту галіну жывёлагадоўлі [1, с. 395]. Супрацілеглым ад павер'яў у тое, што ведзьма можа стаць чарапахай і красці малако, існавала меркаванне, што калі чарапаху трымаць ў цэбры з пойлам для скаціны, то будзе больш малака і яно будае якасней. Лічылася, што такім чынам таксама можна засцерагчы карову ад урокаў [2, с. 548].

Вобраз чарапахі вельмі сціпла прадстаўлены ў беларускім фальклоры. У асноўным выяўляецца яе рысы павольнасці і марудлівасці у традыцыйных народных параўнаннях: «*паўзе як чарапаха*», «*цягнецца бы чарапаха*» [8, с. 98]. Аднак яе нетыповы для беларускай фауны знешні выгляд, адметныя рысы яе жыццядзейнасці адбіліся ў шматлікіх фразеалагізмах, такіх як: «*раздзелаў як Бог чарапаху*». «*скураная чарапаха*» і інш.

Такім чынам семантычныя аспекты вобраза чарапахі знайшлі сваё месца ў традыцыйнай культуры беларусаў і іншых славян. Трэба адзначыць слабую асэнсаванасць і выяўленнасць іх ў беларускім фальклорным і міфалагічным кантэксце. На мой погляд, прычына гэтага закладзены ў маларапаўсюджаннасці гэтага віда на пэўнай тэрыторыі, у скрытным ладзе існавання. Выражаныя вышэй прыклады дазваляюць вылучыць некаторыя аспекты семантыкі чарапахі: далучэнне да гадаў, да прадстаўнікоў хтанічнага свету, станоўчы ўплыў на некаторыі галіны жывёлагадоўлі, падабенства з семантычнымі вобразамі такіх жывёл як змяя, тхор, крот, жаба.

**Спіс літаратуры:**


1. Гура, А.В. Символика животных в славянской народной традиции / А.В. Гура. - М. : Індрік, 1997. - 912с. (Традіціонная духовная культура славян \ Современные ісследованія.)
2. Беларуская міфалогія : энцэклапед. слоўн. / С. Санько [ і інш.] ; склад. І. Клімовіч. - 2-ое выд., дап. - Мінск : Беларусь, 2006. - 599 е.: іл.
3. Поболь, Л.Д. Славянские древности Белоруссии (ранний этап зарубинецкой культуры) / Л.Д. Поболь. - Мінск, 1971.-245 с.


РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

4. Журавлев, А.Ф. Домашний скот в поверьях и магии восточных славян Этнографические и этнолтнгвистические очерки / А.Ф. Журавлев. - М., 1994. - С. 26.
5. Полесский этнолигвистический сборник. Материалы и исследования / отв. ред. Н.И. Толстой. - М„ 1983.
6. Зайкоўскі, Э, Духоўная культура у бронзавым веку на Беларусі 2010 Library.by
7. Ананьева, Н.Б., Орлов, Н.Л., Халиков, Р. Г., Даревский И. С., Рябов С. А., Барабанов А. В. Атлас пресмыкающихся Северной Евразии (таксономическое разнообразие, географическое распространение и природоохранный статус). — СПб.: Зоологический институт РАН, 2004. — С. 21
8. Жывёльны свет : тэматычны слоўнік / склад **В**.Дз. Астрэйка і інш.; рэд. Л.П. Кунцэвіч, А.А. Крывіцкі. - Мінск, 1999.
9. Рус. пер.: Фасмер М. Этимологический словарь русского языка. — 1-е изд. — Т. 4.— М„ 1964— 1973.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ